РЭДКАЕ ПАЛЯВАННЕ

Славіцца наш край сваімі азёрамі, шмат звяроў яшчэ можна сустрэць у лясах. Некаму пашчасціць на лася або казулю, на дзіка або зайца, вавёрку, лісу, куніцу, барсука, нават на бурага мядзведзя! І тады пільным вокам можна глядзець на іх, а, калі ёсць чым — сфатаграфаваць альбо... выстраліць.

Сярод людзей, як вядома, шмат аматараў паляванння. Іх, як той казаў, хлебам не кармі, дай пацягацца па лясах ды палях, дай потым зайца дамоў прынесці! А калі не прынёс, — то ты...

Адно слова — ніякі не паляўнічы! Зрэшты, пра тое па парадку.

Райцэнтр, значыцца, нядзеля, аўтастанцыя. Там, у чаканні аўтобуса, выпадкова сустрэліся дзве кабеты, якія некалі разам вучыліся ў школе, разам бегалі на танцы, а потым... Адна з іх выйшла замуж за мясцовага хлопца і засталася ў роднай вёсцы, другая — выбрала горад, прыжылася і цяпер вось ехала ў тую ж вёску праведаць матулю. Слова за слова, як водзіцца, і пацякла гутарка — пра гэта, пра тое... Нарэшце:

— А чаму ты на аўтобусе? — спытала гараджанка. — Мама ж казала, што вы «Жыгулі» купілі.

— Бывала, што й варона кувала, а цяпер...

Вяскоўка цяжка ўздыхнула, трохі памаўчала і праз паўзу дадала:

— Машына досыць дорага нам дасталася. У калгасе ж ведаеш якія заробкі? Мы гадамі эканомілі, капейку да капейкі складалі. І вось, нарэшце, мара збылася: Пеця прыгнаў «Жыгулі», паставіў яе ў гараж, стаў пылінкі здзімаць, а калі і ездзіць, то вельмі асцярожна... Ён наконт гэтага малайчына! Але ж быў!

Аднойчы мы з ім у госці паехалі, пабылі ў дачкі, дамоў пазнавата вярталіся. Дарога, бачым, пустая, знаёмая, у нізінках — месцамі туман. І раптам у ім — заяц!

Я нічога яшчэ не сцяміла, а Пеця ж мой паляўнічы, у яго — азарт: ён тут жа нагою на газ — педаль прыдушыў і ляціць, як хто жару пад хвост насыпаў!

У зайца, — не паверыш — мазгоў, думаеш, болей было? Зразумеў, касы, што ў хуткасці прайграе, — на хітрасць пайшоў: разагнаўся, як мог, а потым у бок, за дрэва...

Пеця на машыне за ім!..

Сорамна прызнавацца, але ж дахаты мы з ім пехатою ішлі. Я, праўда, словамі Пятра падганяла: падсыпала перцу з імбірцам!

Ён у той жа вечар (ці нават ноч) да нашага кума схадзіў, папрасіў, каб завёў трактар, каб нашу «ластаўку» дамоў прыцягнуў. Цяпер во ў гаражы стаіць, рамонту чакае, але ж і на гэта трэба грошай...

Жанчыны трохі памаўчалі, паўздыхалі, потым гараджанка прызнала, што мужчыны — яны як дзеці.

— Мой жа, — сказала, — таксама аматар — і рыбу палавіць, і на зайца схадзіць. Праўда, з сабакам, з дубальтоўкай... А вось каб на машыне... Такое не кожны зможа.

Іван Букоўскі,
в. Шуневічы, Глыбоцкі раён.

ЧАГО БАІЦЦА АГОНЬ

Гэтую гісторыю мне расказвала мама і пачынала з таго, што нашы суседзі — цёткa Зоя з сям'ёй — надумалі пабудаваць лазню. Пабач з іхняй хатай раслі пладовыя дрэвы, таму будоўлю прыйшлося распачаць бліжэй да нашага дома. Нічога дрэннага ў гэтым мы не бачылі, нават наадварот: потым, калі лазню адкрылі, нам падабаўся пах дыму, не замінаў і вясёлы гоман людзей... Але ж гэта, як водзіца, да пары.

Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

З цягам часу многае змянілася: у цёткі Зоі не стала гаспадара, паз'язджалі ў горад сыны. Жанчына засталася адна: сама трымала дом і сякую-такую гаспадарку, сама ж, хай значна радзей, але рыхтавала лазню, з найбольшай радасцю — калі ў госці чакала дзяцей.

Дык вось, аднойчы перад самым іх прыездам цёткa нешта занядужала, папрасіла свата (ён жыў паблізу), каб падмяніў. Той, дзядзька Сямён, чалавек быў ленаваты. Для таго каб нешта зрабіў, яго трэба было задобрыць: наліць чарачку-другую. Цёткa Зоя, ведаючы гэта, паабяцала, што «за ёй не заржавее», але ж — потым, калі лазня будзе гатовая.

Сямён хоць-нехаць узяўся за справу: нанасіў са студні вады, насек дроў, як патрэбна, самых доўгіх — насунуў у топку. Дзверцы не зачыніліся. «Нічога страшнага, — падумаў дзядзька, — трохі прагараць — падапхну далей».

Ён і сапраўды прысеў на ўслончык, стаў глядзець на агонь і чакаць, але ж доўга не вытрымаў: пакіраваўся шукаць спіртное...

А тым часам дровы ў топцы не на жарт разгарэліся — некалькі галавешак выпала на падлогу, заняўся агонь.

Цёткa Зоя заўважыла яго праз акно, з крыкам: «Людцы, ратуйце! Пажар!» — яна выскачыла з хаты і спынілася, бо ў прылазніку трымала газавы балон, які мог «ірвануць» у любую хвіліну. І ніхто не ведаў куды пасля перакінецца агонь.

...Мая мама вывела з хаты ўнукаў, а сама кінулася выносіць рэчы. Бабуля Клава зняла з покуці ікону і, молячы Бога, каб адвёў бяду, стала хадзіць з ёй вакол палаючай лазні. Тата ж аберуч схапіў плуг і насіўся з ім па сялібе.

Хутка раздаўся выбух, загарэўся суседскі хлеў, але ж ніякай жыўнасці там не было, ды і агонь тушылі пажарныя. Усё абышлося! Малой крывёю.

А вось размоў пасля — было вельмі шмат! Нехта бэсціў п'яніцу дзядзьку Сямёна, нехта шкадаваў цётку Зою і хваліў пажарнікаў. Старэйшыя вяскоўцы казалі, што бяду ад вёскі адвяла бабуля і яе ікона, маладыя (з рогатам) — што наш тата. Маўляў, калі б не ён з плугам наперавес, загарэліся б іншыя хаты...

Так ці іначай суседзі, якія тады пацярпелі ад пажару, пабудавалі сабе новы хлеў; за лазню цёткa Зоя так і не ўзялася, сказала, што хопіць з яе адной, страчанай... Але ж са сватам хутка памірылася: нідзе не дзенешся — трэба гадаваць унукаў. Ды і дзядзьку пасля пажару як падмянілі: ва ўсякім разе, спіртнога ён у рот не браў: адмовіўся — раз і назаўжды.

Таццяна Чэкед,
г. Гомель.

ХТО ПЫТАЕ, ТОЙ НЕ БЛУДЗІЦЬ?

Пра што, сустрэўшыся ці стэлефанаваўшыся, размаўляюць пенсіянеры? Ну вядома ж, пра палітыку і жыццё-быццё, пра сваё мінулае, а найбольш, відаць — пра дзяцей ды ўнукаў. «Мае растуць, як тыя грыбы! — хваліцца студэнцкі сябрук Валера. — Малодшаму ўжо дзесяць!» — «І мая, — кажу, — не адстае! Здаецца, толькі ўчора з радзільні забралі, а сёння — ужо ў садку! Бягуць гады!» — «Яшчэ і як бягуць! — згаджаецца Валера. — У сына хутка сярэбранае вяселле. Рыхтуемся адзначаць... Можа, і ты пад'едзеш? — запрашае аднакурснік. — Але ж не так, як яго сябры!.. Дарэчы, смешная была гісторыя! Якраз для «звяздоўскай» рубрыкі! Дару сюжэт — як Пушкін Гогалю.

Мікалай Васілевіч — наколькі помню — ад падоранага не адмовіўся. Вось і я не буду: за што купіў, за тое і прадам.

«Мой сын толькі скончыў інстытут, — здалёк пачаў Валера, — і ледзь не адразу ж з навіной: «Жанюся, тата».

З аднаго боку, — стаў прыкідваць я, — малады, ранавата, а з іншага... Чаго цягнуць, калі дзеўка добрая? Трэба ладзіць вяселле — каб па-людску ўсё, каб як мае быць... Пытанне, дзе, на якой «пляцоўцы»?

Жылі мы тады ў вялікім пасёлку, дом стаяў наўскасяк ад школы — новай, прыгожай. Па суботах, ведаем, дзеці не вучацца — памяшканні, можна сказаць, гуляюць. Дык чаму б у арэнду не здаць (тую ж сталоўку), для школы грошай не зарабіць? Патрэб жа хапае...

Карацей, у той дзень на нашай вуліцы Будаўнікоў — хочаце верце, хочаце не — але спраўлялі аж два вяселлі: нашы суседзі — у той самай школе, мы сваё — дома. Апроч радні, сын сяброў на банкет запрасіў, «аднапакойнікаў» па інтэрнаце.

Дабірацца ім, праўда, не так лёгка было: ноччу, здалёк, спачатку цягніком, які спыняўся ледзь не каля кожнага слупа, потым — ад станцыі — рэйсавым аўтобусам.

Стаміліся нашы хлопцы, але ж вуліцу Будаўнікоў апыталі хутка (нумар дома непатрэбны быў: са школьнай сталоўкі на ўсю моц грымелі дынамікі. Наша, жывая, сапраўдная музыка — скрыпка, гармонік і бубен — я сам пад такую жаніўся — туды не далятала)...

Ды і чаго было прыслухоўвацца, калі даехалі, калі іх яшчэ на школьным ганку гасцінна сустрэлі, пасадзілі за святочны стол (без маладых пакуль, тыя — не вярнуліся з загса), калі налілі па поўнай чарцы і наставілі закусак...

Хто яны, — ніхто не пытаўся: радня жаніха думала, што госці з боку нявесты. І наадварот...

Хлопцы, карацей, кульнулі па некалькі чарак, добра падмацаваліся, павесялелі, а тут і вясельны картэж: усіх нібы ветрам са сталоўкі знесла: пабеглі сустракаць маладых!

Тройца рушыла следам і тут жа зразумела, што трэба «рабіць ногі»: жаніх быў зусім незнаёмы. Нявеста і пагатоў!

Пад шумок, непрыкметна хлопцы выйшлі са школы, у роздуме, што рабіць, пайшлі па вуліцы.

На шчасце, я ў гэты час выйшаў на балкон пакурыць. Прыгледзеўся: дык гэта ж свае — сынавы сябры! Я ў інтэрнат ім гасцінцы прывозіў!

Выбег насустрач (твары, як тры пажары!), павітаў...

Бачу, першы хмель у гасцей як рукою зняло! Можа, таму, што ён быў выпадковы?

Іншая рэч — другі: з радасці за сябра і яго законную палавіну, з гонару за сябе: якніяк дабраліся, павіншавалі, пажадалі, каб усё ў маладых было як належыць: каб разам — у смутку і ў радасці!

Здаецца, збылося?»

Мікалай Ком,
г. Орша.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

АСОБА І ГІСТОРЫЯ

Калі ўзрост мае значэнне

ЗАЎТРА праваслаўныя ўшаноўваюць памяць святой Сафіі Слуцкай. Гэта адна з нешматлікіх у Беларусі славутых асоб, памяць аб якой, так бы мовіць, ёсць у матэрыяльным увасабленні — у Свята-Духавым кафедральным саборы знаходзяцца яе мошчы. Памятаеце, як ісці да іконы Маці Божай Мінскай, злева ў нефе невялікая жаночая фігурка пад залацістым пакрывалам. Гэта яна, святая Сафія. Пачынаеш чытаць пра яе жыццё — здзіўляешся мужнасці і, як бы сёння сказалі, прынцыповасці гэтай жанчыны, якая жыла больш за чатырыста гадоў таму. Дачка славутага княжацкага роду Алелькавічаў, яна ў няпоўныя дзесяць гадоў засталася круглай сіратой. Пасля памерлі і яе дзядзькі, і дзяўчынка-падлетак стала самай багатай нявестай ва ўсёй Рэчы Паспалітай. Выхоўвалася ў апекуноў Хадкевічаў, спачатку ў Брэсце, потым у Вільні. Яе сасваталі за гэтаксама багатага знатнага нашчадка з роду Радзівілаў. Але Радзівілы на той момант былі пратэстантамі. І дзяўчына, не пярэчачы волі дарослых, паставіла толькі адну ўмову свайго замужжа: яе не будуць прымушаць мяняць праваслаўнае веравызнанне, а дзеці, якія народзяцца ад шлюбу, таксама будуць праваслаўныя. Яна была, паўтаруся, самай багатай нявестай вялікай краіны і магла дыктаваць свае ўмовы. Выйшаўшы замуж, маладая княгіня апекавалася захаваннем праваслаўя на Слуцкай зямлі. А было гэта пасля прыняцця Брэсцкай уніі, калі праваслаўныя прыходы нярэдка гвалтам «перахрышчвалі» ва ўніяцкія. Мала таго, яна дабілася ад маладога мужа, каб ён выпрасіў у караля права для Слуцкіх зямель заставацца праваслаўнымі. І кароль даў такі дазвол...

Жыццеапісанне святой прыведзена ў вельмі скарочаным выглядзе. Засталася па-за ўвагай сапраўдная вайна паміж Хадкевічамі і Радзівіламі яшчэ да яе вяселля, і ў многім дзякуючы князёўне Сафіі ўдалося пазбегнуць вялікай крыві. Але нават у гэтым скарочаным жыццяпісе — ведаеце, што ўражвае найбольш? Узрост святой. Яна выйшла замуж у пятнаццаць гадоў, памерла з родаў у дваццаць чатыры. Атрымліваецца, усю гэту стойкасць, прынцыповасць праяўляла — прычым так, што падпарадкоўваўся нават кароль — маладзенькае дзяўчо, зусім дзіця, як па сённяшнім разуменні.

Апасля вось гэтага здзіўлення і ўсведамлення пачынаеш разважаць ужо пра іншае. Пра тое, у якім інфантыльным грамадстве мы жывём сёння, пра тое, як не хочуць станавіцца дарослымі нашы дзеці, а мы ім у гэтым нежаданні з ахвотай патураем. Толькі часам, калі ўжо зусім нешта «дастане», кідаем злосна здароваму бэйбусу, які нават ложак сам запраўляць не ўмее: «Гайдар у твае гады палком камандаваў!» На што барадаты «дзіцёнак» або прамаўчыць, або, калі больш начытаны, агрызнецца: «У нас жа не грамадзянская вайна...» І што мы на гэта? Правільна, ідзём засцілаем за бэйбусам ложак.

Пятнаццацігадовым цвыгаўкам сёння не трэба вырашаць лёс дынастычнага шлюбу і веравызнання — час змяніўся. Але ці многія з іх маюць уяўленне аб элементарных побытавых рэчах — уключыць пральную машынку, напрыклад, а пасля дастаць і развесіць памытае? Пішу, бо ведаю такіх маміных дзяўчынак, якія разумення не маюць, як да машынкі або да пліты падысці. Навошта, калі ёсць маці і бабуля, лепш павыстаўляць пасты ў сацыяльных сетках, назбіраць лайкаў, пацешыць сваё самалюбства. І добра, калі, крыху пасталеўшы, яны паступяць вучыцца, атрымаюць прафесію. Але няма гарантыі таго, што, нават скончыўшы ВНУ, сынок ці дачушка «ў пошуках сябе», якія могуць ну вельмі зацягнуцца, не сядуць трывала на бацькоўскую шыю. Прынамсі, думаю, што кожны з чытачоў падобны прыклад прыгадае — і не адзін.

НЯДАЎНА ў кампаніі тых самых бацькоў, якім сёння па сорак пяць плюс, мы разважалі, чаму ў нашага пакалення, якое рана пасталела ў цяжкія 90-я, выраслі такія інфантыльныя, нярэдка не прыстасаваныя да жыцця нашчадкі. Прыйшлі да высновы, што вінаватыя ва ўсім цяплічныя ўмовы. Яны з'явіліся па аб'ектыўных прычынах: жыць стала спакайней і багацей, не трэба думаць, што паесці і апрануць. Але гэтыя ўмовы яшчэ больш ствараем мы самі, бо хочам, каб яны жылі лепш, чым мы, праўда? — Толькі кожны вопытны агароднік скажа, што, калі цяпліцу клапатліва, каб не дай бог што не здарылася, трымаць зачыненай, парасткі стануць квольмі і нежыццяздольнымі.

ДЗЯКУЙ богу, у нас сёння не пачатак сямнаццатага стагоддзя, калі выбар веры мог каштаваць жыцця, дый не пачатак або сярэдзіна дваццатага, калі дзеці вымушаны былі ісці ваяваць. І нашым падлеткам не трэба быць Сафіяй Слуцкай або Аркадзем Голікавым ці Маратам Казеем. Але часы і сёння няпростыя. І лёгка наўрад ці будзе — у найбліжэйшыя месяцы, а можа, і гады. Можа, гэтыя няпростыя часы прымусяць нашых вялікаўзроставых дзяцей стаць нарэшце дарослымі? Не святымі, не героямі — проста людзьмі, якім не страшна будзе пакінуць свой дом і сваю зямлю.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.